102 /140/

Не народ для ўрада, а ўрад для народа

Кастусь Каліноўскі

РЭСПУБЛІКА

ГАЗЕТА ДЛЯ ТЫХ, ХТО САМАСТОЙНА ПРЫМАЕ РАШЭННІ

АЎТОРАК, 2 чэрвеня 1992 г.

Выдаецца з чэрвеня 1991 г.
Кошт 1 руб.



Землякі

Здымі шляпу перад квітнеючым садам

У трыццаць пяць год Іван пачаў карчаваць стары бацькавы сад і закладваць новы -- свой. Ён вырашыў уласнаручна ствараць на зямлі райскі кут. І гэта яму, здаецца, удалося. Такое, напэўна, адбылося б з кожным, каму дадзена нарадзіцца садоўнікам.

І яшчэ трыццаць пяць вёснаў мінула. Састарэлі ягоныя дрэвы. А душа, яна па-ранейшаму святкуе ў час белых садоў, і ён гатовы здымаць шляпу перад кожным квітнеючым дрэвам.

Іван памятае, як у трыццаць другім палякі зрабілі "футары". З таго часу Літоўка а 96 дварах так і не сабралася ў адну купіну. А шмат якія падворкі ўжо зніклі. Сядзіба ж Кірыліка квітнела! Асабліва, калі гаспадарка перайшла да Івана. Памочнікамі ў яго былі жонка і чатыры дачкі. Дарма, што вакол шалела хрушчоўская кампанія па вынішчэнню садоў. Ён гатовы быў плаціць любыя падаткі, бо майская квецень была даражэй. Працаваў спачатку калгасным рахункаводам /адукацыю меў 7 класаў/, а затым леспрамгасаўскім майстрам... Але сапраўдную радасць працы Іван знаходзіў хіба толькі на ўласных 60 сотках, якія атрымаў у заахвочванне, як адзін з першых, уступіўшых у калгас. Хаця і дома насіў трывогу пад сэрцам, што аднойчы, як далі зямлю, так могуць яе і забраць. Прахам пойдзе і сад, і пчолы, і птушкі. І ўсё-ткі ён быў і застаецца аптымістам.

Апантаная праца хутка дала жаданыя вынікі. Вывеў сорт яблыкаў, якія могуць захоўвацца зімой у склепе альбо ў капцы разам з бульбаю, ці наогул захоўвацца два гады. Садавіны часам пладзілася гэтулькі, што не ведаў, куды падзець. Даваў аб'явы у раёнку, што можа забяспечыць усе дзіцячыя садкі. Ахвяраваў і вайскоўцам, і ў бальніцу. Абы не прападала. Але добры дзесятак тон яблыкаў ды груш ўсё роўна гніло. Мёду вывозіў у Мінск да васьмі тон у сезон, бо меў больш 120 вуллёў, з якіх тры былі аддадзены пад чмяліныя сем'і.

Дабрачыннасць селяніна з Літоўкі выяўлялася ў розных формах. Было і такое, што 15 працэнтаў свайго заробку на калгаснай службе ён штомесяц ахвяраваў ў Фонд міру, а затым і 50 працэнтаў небагатай пенсіі. Толькі ягоны пачын у гаспадарцы так ніхто і не падтрымаў.

Калі з дому "выпырхнула" самая меньшая, і да таго ж занядужала жонка, Іван зразумеў, што яго райскія часы адыходзяць.

У садзе стаў валадарыць закон здзічэння. Але для птушак тут усё роўна быў рай. Жонка і цяпер часам бурчыць: "Згубілі цябе твае птушкі" і вясновымі вечарамі шчыльна завешвае вокны коўдрамі, а вушы затыкае ватай. Бо за вокнамі творыцца неверагоднае. Ці не з усяе акругі злятаюцца сюды салаў'і і наладжваюць такія "пахвісцёлы", што празаічнай душы тут не да мілавання. Гаспадар жа толькі лыбу дае, цешыцца. Усю зіму вясны чакаў, "каб салаў'я наслухацца". Такія ночы -- свята.

Не толькі дзеля салодкіх птушыных гармоній Іван дазволіў птаству гаспадарыць на сваёй тэрыторыі. Ён узяў іх у памагатыя і не памыліўся, бо ніколі не меў клопату выводзіць шкодных насякомых. Сады на суседніх хутарах, дзякуючы Іванавым птушкам, таксама былі чыстыя. Самым лепшым з крылатых ён называў вераб'я, бо самы працавіты. Але выводзіліся тут не толькі звычайныя для слыху шпакі, сініцы, салаў'і, але і крапіўніцы, чорныя дразды, дзятлы, ткачы, аўсяніцы. Для гэтага былі створаны ўсе ўмовы -- больш паўтысячы домікаў развесіў садоўнік на дрэвах. Пад стрэхамі таксама процьма гнёздаў -- водзяцца дзікія галубы-перапялятнікі, совы, летам па садзе бегаюць курапаткі. Бывае, набярэ Іван на балоце качыных яек ды пад квахтуху падкладзе. Выгадуюцца качаняты, вырастуць за лета, а восенню пырх, ды ў вырай. Жыў у Івана і каршак. Сваіх курэй ды птушак не душыў -- на чужыя двары налёты рабіў. Высачылі суседзі злачынца, пажаліліся. Прыйшлося птушку выселіць -- гняздо раскідаць.

-- Былі тут і змеі, -- кажа Іван, -- дык я іх вужакамі вывеў. Жылі і вавёркі, але іх суседскі сібірскі кот палавіў. Летам, калі час падкошваць заросль куток агарода, Іван асцярожна, каб не парушыць птушынага спакою, агледзіць і не кране касою, пакіне купінку з хаткаю. Разумеючы, як цяжка гадавацца птушанятам у такім шматлікім суседстве, Іван падкормлівае руплівых "бацькоў"...

Вечарам, за смачным сталом, Іван разважаў з мяккай усмешкай: "Ці магу я кінуць піць, калі мне гэта ідзе? Дык навошта крыўдзіць сябе перад смерцю?" Мы не "пакрыўдзілі" сябе гаспадарскімі напоямі. Потым выйшлі на парог. Іван узяўся дразніць птушак і настройваць іх на начныя спеўкі.

Анатоль КЛЯШЧУК

Ляхавіцкі раён

Фота аўтара

Эхо события

"МЕЛОЧЬ" ОСТАЕТСЯ ПРЕЖНЕЙ

Для поддержки и защиты новорожденного белорусского рубля создана комиссия Совета Министров по координации работы и оперативному решению вопросов параллельного обращения советских дензнаков и расчетных билетов Национального банка Беларуси. Комиссия уже заседала и разослала телеграмму во все министерства, банки и т.д. В ней, в частности, разъясняется, что переоценки разменной монеты не будет. "Мелочь" идет по номиналу,как и прежде. Совместители будут получать расчетные билеты на всех своих работах. Переводы из других стран наполовину будут выплачиваться билетами.

Сотрудники Национального банка планируют в среду в прямом эфире ответить на вопросы телезрителей. А на мой вопрос "Как же быть с коммерческими магазинами, которые этих новых денег не берут?" начальник управления денежного обращения Национального банка Тамара Корженевская ответила так: "Пока планируется лишь разъяснительная работа. Возможно введение штрафных санкций, но это прерогатива Верховного Совета". Кстати, подобные меры как-то не оправдали себя в Литве.

Максим ТАБОРОВ

О развитии учреждений культуры в Республике Беларусь

В начале 1992 года в республике работал 21 профессиональный театр, в 1985 году их было 17. За этот период открыты Белорусский театр "Лялькi" в г.Витебске, мозырский драматический театр "Верасень", Слонимский драматический театр, областной театр кукол "Батлейка" в г.Молодечно. Из общего числа театров -- 7 работают на белорусском языке, 10 -- на русском и белорусском языках и 4 -- на русском языке.

Расширилась сеть концертных организаций. Сейчас их 12. Открыты Брестская, Витебская, Гродненская и Могилевская областные филармонии.

Однако интерес населения к посещению учреждений культуры и искусства снижается, что видно из следующих данных:

	1985	1990	1991	1991 в % к	
				1985	1990
Число театров	17	21	21	124	100
Число посещений театров -- тыс.	3274	2604	2442	75	94
на 1000 человек населения	327	254	238	x	x
Число концертных организаций	6	12	12	200	100
Обслужено слушателей -- тыс.	4654	4910	3644	78	74
Число музеев /включая филиалы/	90	111	121	134	109
Число посещений музеев -- тыс.	4902	4582	3451	70	75
Число киноустановок	7377	6916	5976	81	86
в том числе кинотеатров городских	182	194	196	108	101
Число посещений киносеансов -- млн.	140	117	94	67	81
в том числе кинотеатров городских	65	56	46	70	82

Сокращение числа зрителей вызвано, в основном, ростом цен на билеты в кино, театры, на концерты, в музеи. Если за 1991 год по сравнению с 1990 годом цены на билеты в кино увеличились в 2,1 раза, на концерты -- в 1,7 раза, в музеи -- на 31%, в театры и цирки -- на 21%, то в марте текущего года по сравнению с мартом прошлого года они возросли в 4 раза в кино, цирки и на концерты, в музеи -- в 3 раза и в театры -- в 2 раза.

О деятельности кооперативов

На начало 1992 года в республике действовало 4432 кооператива, в том числе в г.Минске -- 1627, Витебской области -- 581, Минской -- 550, Могилевской -- 535, Брестской -- 423, Гомельской -- 397, Гродненской -- 319 кооперативов.

Основные показатели деятельности кооперативов характеризуются следующими данными:

	Число действующих кооперативов	Численность работающих в них /включая совместителей/, тыс.человек	Объем реализованной продукции /работ, услуг/, млн.руб.	Фонд оплаты труда /включая совместителей/, млн.руб.
Все кооперативы	4432	101,4	1945,0	620,2
в том числе:				
по производству товаров народного потребления	596	16,2	334,9	90,4
по выпуску продукции производственно-технического назначения	227	5,5	126,5	36,2
общественного питания, торговые и торгово-закупочные	117	1,9	143,0	8,5
по заготовке и переработке вторичного сырья	69	1,8	46,0	13,1
строительные, проектно-изыскательские по обслуживанию строительства	1865	51,8	890,5	351,9
научно-исследовательские, проектно-конструкторские, по разработке программных средств, оказанию информационных услуг	324	6,7	163,3	35,9
сельскохозяйственные	104	1,1	14,9	6,3
по оказанию платных услуг	481	6,0	57,1	20,0
художественно-оформительские	103	1,2	15,2	7,6
прочие	546	9,2	153,6	50,3

Кооперативами в 1991 году реализовано продукции, выполнено работ и оказано услуг на 1,9 млрд. рублей против 1,5 млрд. рублей в 1990 году. В среднем одним кооперативом было произведено продукции и оказано услуг на 438,9 тыс.рублей /в 1990 г. -- 242,2 тыс. рублей/.

Наибольшее распространение кооперативное движение получило в строительстве, по производству товаров народного потребления, бытовому обслуживанию населения, выпуску продукции производственно-технического назначения. Доля этих кооперативов в общей численности кооперативов составила 63%, а в общем объеме реализованной продукции -- 70%.

Выручка от реализации товаров народного потребления возросла в 1991 году по сравнению с предыдущим годом на 46% и составила 334,9 млн. рублей. Удельный вес товаров народного потребления, произведенных кооперативами, в общем объеме произведенных товаров в республике составил 0,8% /в 1990 г. -- 1,1%/.

На долю кооперативов, оказывающих различные услуги населению, приходилось 11% их общего числа. Ими оказано платных услуг на 57,1 млн. рублей /в 1990 г. -- 53 млн. рублей/. Удельный вес бытовых услуг, оказанных населению кооперативами, составил 1,1% в общем объеме реализации бытовых услуг.

Кооперативы не оказывают существенного влияния на увеличение производства товаров и оказания услуг.

Госкомстат Республики Беларусь

Верховный Совет дешевле батальона?

Станислав Шушкевич встретился с заместителями председателей районных Советов, председателями и секретарями сельсоветов, которые занимаются на курсах повышения квалификации советских работников.

Приводим выдержки из его выступления

О ташкентской встрече

-- Без СНГ нам будет еще тяжелее... Встреча в Ташкенте, безусловно, показала жизнеспособность Содружества и стремление участников к его укреплению. То, что Беларусь не подписала Договор о коллективной обороне, свидетельствует о нашей последовательности в своей политике, желании быть нейтральной, безъядерной страной.

О поездке в Брестскую область

-- Все то хорошее, что есть в области, нужно сохранять. Да, здесь много модных колхозов и совхозов с прекрасными показателями. Возможно, поэтому там очень сильны и антифермерские настроения. Я не против колхозов, но они не должны быть препятствием становления других форм хозяйствования на земле.

Обстановка в республике

-- Мы переживаем катастрофически напряженный момент в финансово-экономических отношениях со странами СНГ, в первую очередь -- с Россией. По состоянию на 27 мая, Беларусь задолжала 70 миллиардов рублей, а нам россияне -- 90 миллиардов.

Разговоры о защите прав, но без конкретных сдвигов на деле, надоели, и потому всякий "борец" видится болтуном, если он говорит не об укреплении экономики и улучшении жизненного уровня.

О Верховном Совете и Контрольной палате

-- Штат ответственных работников аппарата ВС увеличился более чем в три раза -- с 54 до 174 человек. Но едва ли уместно в этом случае говорить о "разбухании" -- мы обязаны создать профессиональные управленческие структуры. Это диктуют время и ситуация в стране. Между прочим, на содержание своего аппарата мы тратим не больше, чем на содержание одного армейского батальона.

Что касается Контрольной палаты -- в ее составе будет около 270 сотрудников. Много? Опыт наших литовских соседей говорит: все средства, вложенные в контрольные ведомства, очень быстро окупаются.

О местных Советах

-- Возможно, количество их следует уменьшить. Очевидно и то, что следует укреплять исполнительную власть на всех уровнях. Не секрет, что в ряде мест Советы саботируют реформы, в частности -- земельную. Подобный "стиль" характерен для тех, кто только и может, что "руководить". Для такой прослойки любые реформы -- катастрофа.

О референдуме

-- Мое мнение: закон надо уважать. Есть подписи, есть желание избирателей, и проигнорировать это -- позор для власти.

Но при всем этом народ должен оградить себя от безрассудства политиков.

Комментарий отдела политики и права "Р"

Встреча навела на целый ряд мыслей. Представители местных органов -- районщики и сельчане, -- в адрес которых часто слышатся упреки в игнорировании и саботаже реформ, были очень спокойны и любопытны в меру. Правда, и любопытство это оказалось довольно односторонним: интерес у слушателей вызвало мнение Станислава Шушкевича о сохранении их должностей, численности штатов республиканских органов. В то же время не странно ли, что не прозвучало ни единого вопроса о проблемах местной власти, а ведь их, как известно, великое множество: и местные бюджеты, и социальная защита, и применение новых законов.

Нелогичным мне показалось и то, что вопросы задавались лишь одной стороной. Увы, такова практика всех подобных встреч. Руководство обычно спрашивает в других местах. Но, думается, эффект общения с аудиторией мог бы быть неизмеримо выше, если бы вопросы задавал и глава парламента. Беру на себя смелость утверждать, что их у Станислава Шушкевича к местной власти скопилось немало...

Петр РАШИНСКИЙ

Под"р"обности

Будет в Минске отделение ООН -- ПРООН

В Женеве завершила работу 39-я сессия совета управляющих Программы развития ООН /ПРООН/, в которой приняла участие и делегация нашей республики, возглавляемая заместителем Председателя Совета Министров Беларуси, председателем Госэкономплана Сергеем Лингом.

Одним из главных вопросов, который обсуждался на сессии, было оказание помощи странам Восточной Европы и СНГ, в том числе и Беларуси, по переходу к рыночной системе. Выступая в общей дискуссии, глава белорусской делегации отметил, что успех реформ в республике будет зависеть как от политической воли ее правительства и необходимой поддержки населения, так и от широкой помощи со стороны западных стран, сотрудничества с такими влиятельными экономическими и валютно-финансовыми организациями, как Международный валютный фонд, Мировой банк, Комиссия Европейских Сообществ, Программа развития ООН и другими. Поэтому республика заинтересована использовать возможности и опыт ПРООН в проведении рыночных реформ в других странах, с вниманием рассмотрит конкретные проекты помощи. При их разработке и осуществлении будут установлены необходимые приоритетные направления сотрудничества.

Участники сессии приняли по вопросу оказания помощи странам Восточной Европы и СНГ по переходу к рыночной системе хозяйства соответствующее решение.

Делегация Беларуси провела ряд встреч с руководством ПРООН, в ходе которых обсуждались вопросы, связанные с реализацией предоставленного нашей республике статуса государства-получателя помощи и формирования в этой связи программы технического содействия. Достигнутые договоренности нашли свое отражение в Меморандуме о взаимопонимании между правительством Беларуси и Программой развития ООН, который был подписан главой белорусской делегации С.Лингом и администратором ПРООН У.Дрейпером.

Сергей Линг также имел встречу с генеральным директором отделения ООН в Женеве М.Бланка. В ходе ее было подписано Соглашение между правительством Беларуси и Организацией Объединенных Наций об учреждении отделения ООН -- ПРООН в Минске.

Владимир СТЕПАНОВ



Сёння

Бізнесменаў Паўднёвай Карэі прыцягвае Беларусь

Заканчваецца візіт у Беларусь дэлегацыі вытворчай карпарацыі з Паўднёвай Карэі. Адразу пасля прыбыцця ў рэспубліку замежныя бізнесмены агледзелі ўчасткі, адведзеныя ім у Мінску пад будаўніцтва бізнес-цэнтра і гасцініц.

Госці пазнаёміліся з аб'яднаннямі "Інтэграл", оптыка-механічным і вылічальнай тэхнікі.

Сёння ўдзельнікі дэлегацыі наведаюць МТЗ, БелаўтаМАЗ, іншыя прадпрыемствы, а таксама маюць намер сустрэцца са старшынёй Савета Міністраў рэспублікі Вячаславам Кебічам, каб абмеркаваць пытанні сумеснага супрацоўніцтва.

Ул.інф.

Сегодня

Каникулы. Но только не у прессы

Пока не ясно, что имели в виду организаторы проводимой в Москве акции "Каникулы свободной прессы", дав ей такое название. Ясно другое: печать пребывает далеко не в "летнем" состоянии. Рынок, судя по всему, пожирает своих подвижников.

Об этом и пойдет речь на открывающемся сегодня в рамках акции международном конгрессе "Печать и рынок". Представители не очень независимых изданий независимых государств Содружества, в том числе и Беларуси, обсудят совместные пути выхода из того леса проблем, в который загнали прессу "свободные" цены. Другого не дано: в противном случае не будет ни свободы, ни читателей.

Соб.инф.

Дружба дружбай, а тытунёк паасобку

У Маскве пачынае сваю работу дзевяты з'езд пісьменнікаў былога СССР. Відаць, не будзе звычайных справаздач, фанфар, якія суправаджалі некалі форумы творчых саюзаў. Ды і праходзіць ён будзе не ў Крамлёўскім палацы, а ў сціплым памяшканні Тэатра кінаакцёра.

Сваё жаданне ўдзельнічаць у форуме пацвердзілі 723 дэлегаты. У тым ліку і пісьменнікі Беларусі.

Як стала вядома, афіцыйная дэлегацыя Саюза пісьменнікаў РБ выехала ў Маскву за два /!/ дні да пачатку работы. На чале са старшынёй прэзідыума СП РБ Васілём Зуёнкам.

Яго намеснік Віктар Супрунчук зазначыў, што "верагодна, будзе падзел маёмасці. Пазіцыі дэлегацый былых саюзных рэспублік вельмі розныя, але гэта пытанне, мусіць, будзе асноўным. У Маскве ўтварылася шмат пісьменніцкіх груповак, якія паміж сабой ніяк не могуць высветліць адносіны, бо вельмі ж хочацца ўсім смачна есці".

Пазіцыя беларускай дэлегацыі ў тым, каб не застацца з пустой торбаю. "Але пісьменнікі як сябравалі паміж сабой, так і будуць сябраваць", -- падкрэсліў Супрунчук.

З'езд працягнецца да 5 чэрвеня.

Леанід СВІРЫДАЎ,
спецыяльны карэспандэнт "Р"

Вчера

Авария -- дочь разгильдяя

В оперативном сборе руководящего состава гражданской обороны Минской области участвовали начальники местных штабов ГО, председатели комиссий по чрезвычайным ситуациям. Цель сбора -- до минимума свести риск для населения от возможных аварий.

В области работает больше пятидесяти взрывоопасных объектов, восемнадцать предприятий используют в производстве пропан, водород и другие отравляющие вещества, пять химически опасных объектов находятся вблизи Минска, и в случае взрыва зона поражения накроет город. Кроме того, по железным дорогам области ежесуточно проходит больше ста вагонов с опасным грузом. Нам бы быть начеку. Но, как отмечалось в докладе начальника штаба ГО области Виктора Малова, некоторые должностные лица, ответственные за безопасность населения, к обязанностям своим относятся, мягко говоря, весьма флегматично. Возможно, поэтому и растет количество крупных аварий. В 1989 году их было восемь, в 91 -- двенадцать, в прошлом -- шестнадцать, в этом...

Владимир ХРАМЕНКОВ

Кстати

"Проскочить" таможню -- это еще не все

Уставшая растущим нелегальным ввозом и вывозом товаров, всевозможными аферами Польша создала особую службу -- Генеральную таможенную инспекцию /ГТИ/, независимую от действующих структур. Ее задачей стало проведение на всей территории страны повторного досмотра товаров, уже прошедших проверку на границе. Прежде подобными операциями занимались сотрудники одного и того же ведомства, что приводило к частым злоупотреблениям.

Как пишет газета "Курьер польски", создаваемая с первого июня сего года по образцу французских и немецких инспекций ГТИ должна укрепить в сознании поляков и приезжающих иностранцев мысль о том,

что недостаточно проскочить границу РП и чувствовать себя в безопасности. В ней будут работать 1500 человек с правом контроля товаров в розничной и оптовой торговой сети в целях установки их происхождения и выявления полученных контрабандным путем. Ведущая столичная газета приводит в этой связи данные, из которых следует, что немногим большая по числу населения Франция восьмикратно превосходит Польшу по таможенному персоналу. Именно это позволяет ей более надежно герметизировать свои рубежи. Причем, весьма солидные накладные расходы на содержание таких штатов окупаются сторицей. По словам представителя по печати Главного таможенного управления РП Кристины Урбаньской, инспекторы ГТИ будут отлично технически экипированы.

Продолжаем тему

У Белгосстраха нету страха.

Перед доморощенными камиссарами Катаньями

В последнее время Белорусская государственная страховая коммерческая организация находится под пристальным вниманием печати, радио и телевидения. Преобразованный из командно-административного Госстраха, делающий свои первые шаги, Белгосстрах вызвал уже недовольство и у части своих сотрудников -- нештатных страховых агентов, которые в конце минувшей недели вышли на площадь перед Домом правительства с требованием "очистить Белгосстрах от коррупции и возродить его как коллективную организацию".

Специальный корреспондент "Р" Петр РОМАНЧУК встретился с первым заместителем генерального директора "Белгосстраха" Виктором ШУСТОМ.

-- Виктор Иванович, что означает в названии организации слово "коммерческая"?

-- Означает то, что форма приведена в соответствие с содержанием: основной деятельностью Госстраха была и есть продажа страховых полисов. Кроме этого, мы должны постоянно пополнять резервы взносов по страхованию жизни, уменьшать страховые тарифы. А для этого следует заниматься инвестиционной деятельностью, то есть получать прибыль от временно свободных средств. А если сказать об изменении форм собственности Госстраха -- то здесь никаких изменений не произошло.

-- А что побудило людей выйти на площадь?

-- В свое время страхование было высокорентабельной отраслью. Теперь мы вынуждены принимать меры, чтобы не пострадали и наши клиенты, и мы сами.

В числе мер, способствующих разумному ведению дела -- и передача контроля за списками страхователей на удержание взносов при страховании жизни штатным работникам наших отделений. С 1 июля нештатные агенты от этих функций освобождаются, значит, и число работников будет уменьшено. Мы своевременно дали об этом информацию.

-- Как будет идти сокращение?

-- Наши отделения должны делать это с учетом реальной загрузки каждого агента. Кое-где, возможно, сократится 15--20 процентов, а в другом месте -- и половина наших нештатных сотрудников.

-- На каких условиях они работают, какая у них зарплата?

-- Агенты работают по сдельной системе оплаты. За первый квартал их средняя зарплата по республике составила 1371 рубль. Но сдельщина есть сдельщина -- в нашем Заводском отделении за апрель агенты получили от 1100 до 5390 рублей. То есть, кто сколько мог, столько и заработал. Попутно хочу отметить, что непопулярной мерой -- сокращением -- мы обеспечим минимальную зарплату и избавимся от непозволительной теперь роскоши -- тех, кто работает спустя рукава...

-- Обычно "резерв" для сокращения -- пенсионеры...

-- У нас они составляют среди агентов 15 процентов. Но это не главный критерий, ведь среди них много прекрасных специалистов, которыми мы дорожим, как и любая организация.

-- За историю Госстраха создан огромный страховой фонд. Где он и что с ним?

-- За период страхования жизни, с 1954 года резервный фонд составил 1,4 миллиарда рублей. С 1967 года половина этих денег была изъята государством. Теперь это межреспубликанский внутренний долг и наша беда: государство нам его не возвращает. Остальные деньги мы помещаем в банки. В этом году мы ожидаем получить за проценты около 80 миллионов рублей.

-- Как они распределятся?

-- 70 процентов суммы идет в резервный фонд, а 30 -- распределятся, как и любая прибыль: 44 процента -- в бюджет, а остальное -- на жилье, технику, горючее и т.д. В текущем году, кстати, учитывая острейшую проблему с жильем, мы вошли с 6 миллионами в долю, 12 миллионов направили на производственное строительство, ведь почти повсеместно наши отделения располагают очень плохими условиями работы.

-- Ваши многочисленные оппоненты упрекают вас, что проценты с оборота не идут в госбюджет, а являются собственностью руководителей Белгосстраха...

-- Во-первых, мы открыты для любых проверок. Кстати, проверки эти были, и подобные обвинения, как выяснилось, беспочвенны. Во-вторых, кто позволит средства страхователей изымать в бюджет?

-- Но на Белгосстрах именно за это был наложен штраф налоговой инспекцией...

-- Рад предоставившейся возможности пролить свет на это "темное дело". В мае прошлого года вышел президентский указ о компенсации накоплений по долгосрочным видам страхования. То есть, республику обязали выплатить гражданам компенсацию в размере 40 процентов от их накоплений па долгосрочных вкладах из средств бюджета. Но Минфин этих денег не дал, их в республике нет. Поэтому, согласовав с Минфином вопрос, мы в прошлом году из резерва взносов на компенсацию выделили 15,9 миллиона рублей и с начала этого -- почти 10 миллионов.

По договоренности с Минфином, мы должны были возместить данные суммы за счет прибыли, полученной от инвестиционной деятельности. Эту часть прибыли, естественно, мы просили освободить от налога. Минфин согласился, но налоговая инспекция узрела в этом "утаивание прибыли от налога". Так что финансовые "нарушения" здесь вполне понятны и объяснимы.

Что же касается пополнения бюджета за счет страхования, то за последние шесть лет мы перечислили 178,2 миллиона рублей -- это 76 процентов нашей прибыли.

-- Госстрах получился зажатым между отчислениями в бюджет и законными требованиями граждан увеличить выплаты...

-- Ответ на этот сложный вопрос подсказывает мировая практика: разумная налоговая политика должна сочетаться с активной инвестиционной деятельностью. Налоги -- это дело нашего парламента, а вот инвестиции -- это наше дело, которое очень многим не нравится. Да, мы вкладывали и будем вкладывать деньги, которые вернутся к нам с процентами, с пользой. А где еще брать средства, если по новым положениям о страховании гражданин, который застраховал, скажем, себя на 10 лет на сумму 10 тысяч рублей по истечении срока должен получить 19 тысяч? Даже дилетант в экономике теперь знает, откуда и как берутся деньги.

-- Так откуда же весь сыр-бор вокруг Белгосстраха?

-- Ясно, что делая первые шаги в новой экономической ситуации, мы не застрахованы от ошибок. Но обвинять нас в коррупции, называть "мафией", "присваивателями" людских денег, навешивать иные подобные ярлыки -- это по меньшей мере некорректно и, между прочим, говорит об истинных целях тех, кто хотел бы развалить систему государственного страхования, кто использует момент для выступления против правительства. Все обвинения против него по поводу Белгосстраха высосаны из пальца и потому оскорбительны.

Послесловие"Р". С 1 июня начинает работу новая для республики организация -- Госстрахнадзор. У нас есть договоренность с руководством в ближайшее время высказать и его отношение к "страстям" вокруг Белгосстраха. Думаем, и страхователям, и страховым работникам будет небезынтересно узнать о функциях этой чрезвычайно любопытной в наше смутное время организации.

С миру по строчке

* Российский Детский фонд передал для детских домов Тверской области один миллион рублей. Светлане и Александру Шулешкиным из поселка Великооктябрьский вручен чек на 50 тысяч рублей. У рабочего стеклозавода "Великий Октябрь" и его супруги трое сыновей. Еще два мальчика и три девочки взяты ими на воспитание из соседнего детского дома.

* Государственный секретарь США Джеймс Бейкер предложил членам Координационного комитета по контролю над экспортом /КОКОМ/ создать совет сотрудничества со странами СНГ и Восточной Европы, чтобы оказать помощь в создании собственной системы по контролю за экспортом.

* Важность развития отношений между Болгарией и странами СНГ подчеркнул председатель Высшего совета Болгарской социалистической партии Жан Виденов.

* Положительное сальдо торгового баланса США в коммерческих связях с бывшим Советским Союзом возросло с 2 млрд.долларов в 1990 году до 2,7 млрд.долларов в 1991 году. При этом в американском экспорте в бывший СССР преобладающее место занимала сельскохозяйственная продукция, объем закупок которой увеличился с 3,1 млрд.долларов в 1990 году до 3,5 млрд.долларов в минувшем году.

* Дважды, в результате ложного срабатывания аварийных защит, был остановлен первый энергоблок -- об этих событиях сообщил отдел информации производственного объединения "Южно-Украинская атомная электростанция".

* Череповецкая милиция перехватила два грузовика с цинком и никелем. Расследование выявило целую группу расхитителей, в которую входили работники управления Череповецкого металлургического комбината и ряда коммерческих структур. Но 40 тонн украденного этими преступниками стратегического сырья -- лишь капля в море хищений металла. Криминалисты полагают, что несметные сокровища металлургов уже попали в сферу интересов мафии.

* Глава российского парламента Руслан Хасбулатов подписал гостевой билет № 1 для свободного прохода в Дом Советов России всемирно известного музыканта Мстислава Ростроповича.

* В течение одной ночи, работая без передышки, военные следователи сумели раскрыть значительную кражу оружия. Со складов учебного центра в Ногинском районе Московской области были украдены 15 автоматов Калашникова и 10 пистолетов "ПМ". Задержаны виновники происшествия -- ими оказались шесть курсантов третьего курса военного училища.

Дайджест мыслей

"Главной целью усилившегося в последние дни давления на Сербию является полная дестабилизация Югославии. Определенные внешние силы, которым уже удалось разрушить бывшую югославскую федерацию, стремятся образовать на Балканах по возможности больше малых государств. Сербия никогда не была служанкой, у ее народа нет хозяина за рубежом, и мы желаем отстоять эту независимость".

Слободан МИЛОШЕВИЧ,
президент Сербии

Па слядах выступленняў "Р"

НАРОДНЫХ "АДМАЗАННІКАЎ" БОЛЬШ НЕ БУДЗЕ?

Пракуратура РБ накіравала кіраўніцтву парламента рэспублікі інфармацыю аб фактах учынення правапарушэнняў некаторымі народнымі дэпутатамі мясцовых Саветаў і практыцы пазбаўлення іх дэпутацкай недатыкальнасці. Пытанне абмеркавана ў Прэзідыуме Вярхоўнага Савета. Прынята адпаведная прапанова. "Р", як ведаюць нашы чытачы, неаднойчы пісала на гэтую тэму, і таму мы сёння працягваем размову, публікуем у скарачэнні афіцыйныя дакументы, дапаўняем іх невялікім каментарыем.

Інфармацыя Пракуратуры РБ аб фактах учынення правапарушэнняў некаторымі народнымі дэпутатамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў і практыцы пазбаўлення іх дэпутацкай недатыкальнасці

Аналіз статыстычных даных апошніх гадоў сведчыць аб тым, што некаторыя дэпутаты не выконваюць ускладзеныя на іх выбаршчыкамі абавязкі. Толькі ў 1991 годзе ў рэспубліцы ўчынілі злачынствы 44 дэпутаты гарадскіх, раённых, пасялковых і сельскіх Саветаў.

Больш за ўсё злачынстваў на "ліку" дэпутатаў Гродзенской вобласці -- 11, Брэсцкай -- 9, Мінскай -- 8, Віцебскай і Магілёўскай -- па 7.

З агульнай колькасці дэпутатаў, якія ўчынілі злачынствы, у 1991 годзе да крымінальнай адказнасці прыцягнута і асуджана 8 чалавек, ці 18 працэнтаў. Саветамі не дадзена згода на прыцягненне да крымінальнай адказнасці 24 дэпутатаў. Праваахоўнымі органамі па розных падставах справы адносна 4 дэпутатаў спынены, і на цяперашні час 8 спраў знаходзіцца ў вядзенні.

Адмова Саветаў народных дэпутатаў у дачы згоды на прыцягненне дэпутатаў да крымінальнай адказнасці часта прыводзіць да грубых парушэнняў устаноўленых законам тэрмінаў расследавання крымінальных спраў, а ў некаторых выпадках да беспакаранасці асоб, учыніўшых злачынствы.

Нярэдка ў асяроддзі дэпутатаў адзначаецца кругавая парука, якая супярэчыць маральным асновам нашага грамадства. Падобныя дзеянні дыскрэдытуюць увесь дэпутацкі корпус рэспублікі.

Маюць месца выпадкі, калі дэпутаты ўчыняюць злачынствы сумесна з іншымі асобамі, але з-за адмовы дачы згоды на іх прыцягненне да крымінальнай адказнасці пазбягаюць заслужанага пакарання, у той час, як астатнія саўдзельнікі адказваюць за свае дзеянні перад законам.

У многіх выпадках асобныя мясцовыя Саветы народных дэпутатаў беспадстаўна адхіляюць прадстаўленні пракурораў. Рашэнні па гэтых пытаннях, як правіла, нічым не абгрунтоўваюцца або ў іх указваецца на немэтазгоднасць прыцягнення дэпутатаў да адказнасці.

Указаныя выпадкі мелі месца ў Гродзенскай вобласці: справа ў дачыненні да дэпутата Слонімскага гарадскога Савета народных дэпутатаў дырэктара Слонімскай нафтабазы Салавей М.П., дэпутата Славаціцкага сельскага Савета Іўеўскага раёна Чаргейка Л.М., дэпутата Іўеўскага пассавета Вялента К.І., дэпутата Галдоўскага сельскага Савета Лідскага раёна Нячая А.П. Падобнае адзначаецца ў Лунінецкім, Кобрынскім, Кіраўскім, Клімавіцкім і Краснапольскім раёнах.

Дапускаюцца парушэнні закона мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў і пры вырашэнні пытанняў аб дачы згоды на прымяненне мер адміністрацыйнага спагнання да дэпутатаў.

Генеральны пракурор
Рэспублікі Беларусь **М.ІГНАТОВІЧ**

Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Аб практыцы пазбаўлення дэпутацкай недатыкальнасці народных дэпутатаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у сувязі з учыненнем імі правапарушэнняў

Разглядзеўшы інфармацыю Пракуратуры Рэспублікі Беларусь аб фактах учынення правапарушэнняў некаторымі народнымі дэпутатамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў і практыцы пазбаўлення іх дэпутацкай недатыкальнасці, Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь адзначае, што такое становішча, калі мясцовыя Саветы ўкрываюць дэпутатаў ад вырашэння пытанняў аб адказнасці за здзяйсненне ўчынкаў, што ўтрымліваюць прыкметы злачынстваў, у далейшым не можа быць цярпімым. Дэпутацкая недатыкальнасць павінна садзейнічаць выкананню дэпутатамі сваіх абавязкаў і не можа выкарыстоўвацца для ўхілення ад прадугледжанай законам адказнасці. Гэта падрывае аўтарытэт дэпутатаў як прадстаўнікоў народа і Саветаў народных дэпутатаў, як органаў дзяржаўнай улады на месцах, парушае канстытуцыйны прынцып аб роўнасці ўсіх грамадзян перад законам.

Пры дачы згоды на прыцягненне народных дэпутатаў да крымінальнай адказнасці непрынцыповую пазіцыю займалі Мікашэвіцкі сельскі, Лахвенскі сельскі, Аніскавецкі сельскі, Крывошынскі сельскі, Ляхавіцкі раённы, Жабінкаўскі раённы, Клейнікаўскі сельскі, Брэсцкі раённы, Вялікасельскі сельскі Саветы народных дэпутатаў Брэсцкай вобласці, Ульскі пасялковы, Бешанковіцкі раённы, Круляўшчынскі сельскі Саветы народных дэпутатаў Віцебскай вобласці, Слонімскі гарадскі, Славаціцкі сельскі, Іўеўскі пасялковы, Галдаўскі сельскі Саветы народных дэпутатаў Гродзенскай вобл., Маладзечанскі раённы, Мінскі пасялковы, Салігорскі раённы, Узбалацкі сельскі, Каменскі сельскі Саветы народных дэпутатаў Мінскай вобласці; Любоніцкі сельскі, Краснапольскі раённы, Клімавіцкі раённы, Будскі сельскі Саветы народных дэпутатаў Магілёўскай вобласці; Фрунзенскі раённы горада Мінска і Мінскі гарадскі Саветы народных дэпутатаў.

У той жа час пракуратура рэспублікі не ў поўнай меры выкарыстоўвае свае паўнамоцтвы для прыцягнення да адказнасці асоб, якія парушаюць дзеючае заканадаўства.

У сувязі з выкладзеным, Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Звярнуць увагу мясцовых Саветаў народных дэпутатаў на неабходнасць безумоўнага і дакладнага выканання Канстытуцыі і заканадаўства Рэспублікі Беларусь пры разглядзе пытанняў аб дачы згоды на прыцягненне да крымінальнай адказнасці, арышт ці прымяненне мер адміністрацыйнага спагнання, якія накладаюцца ў судовым парадку.

2. Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь і ніжэйстаячым пракурорам пры наяўнасці фактаў учынення асобнымі народнымі дэпутатамі мясцовых Саветаў правапарушэнняў, у тым ліку злачынстваў, своечасова і ў поўным аб'ёме выкарыстоўваць сваё права на ўнясенне прадстаўленняў у адпаведныя мясцовыя Саветы для атрымання згоды на пазбаўленне дэпутатаў дэпутацкай недатыкальнасці.

3. Камісіям Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абароны і барацьбы са злачыннасцю забяспечыць кантроль за выкананнем мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў дзеючага заканадаўства пры пазбаўленні народных дэпутатаў дэпутацкай недатыкальнасці.

4. Гэту пастанову апублікаваць у друку.

Старшыня Вярхоўнага Савета
Рэспублікі Беларусь **С.ШУШКЕВІЧ**

Каментарый аддзела палітыкі і права "Р":

Што і гаварыць, вельмі надзейную і важную пастанову прыняў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі. Але яна -- толькі першы, хоць, нарэшце, і рашучы крок у справе барацьбы з дэпутацкай кругавой парукай і другімі агіднымі з'явамі і тэндэнцыямі, што прыжыліся ў некаторых мясцовых Саветах.

Трэба прыкласці шмат аб'яднаных намаганняў, каб кожны дэпутат, які парушыў закон, зрабіў злачынства, атрымліваў сваё на роўных з простымі, як гаворыцца, смяротнымі людзьмі. Папярэджваем: зрабіць гэта будзе вельмі і вельмі складана па мностству прычын. Пацверджанне таму -- паводзіны прадстаўнікоў некаторых мясцовых улад у апошні час, калі на самым высокім узроўні "варыліся" прыведзеныя вышэй дакументы.

У апошні дзень лютага сёлетняга года дэпутат Ленінскага раённага і Бабруйскага гарадскога Савета народных дэпутатаў Я.Марозаў разам з дзвюма сваімі знаёмымі склаў пратакол аб тым, што прадавец магазіна № 8 аддзела рабочага забеспячэння мясцовага рачнога порта І.Выхас у абедзенны перапынак знаходзілася ў магазіне ў нецвярозым стане. Пасля гэтага Марозаў стаў вымагаць у яе праз знаёмых хабар. Калі атрымаў грошы, быў затрыманы з саўдзельнікамі аператыўнай групай міліцыі.

Як вызначыла праверка пракуратуры, аперацыя па выкрыццю хабарнікаў была выканана ў поўнай адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Дэпутацкая недатыкальнасць Марозава пры гэтым не была парушана. Сабранымі доказамі ён быў поўнасцю выкрыты. Але нягледзячы на ўсё гэта, Бабруйскі гарадскі Савет не даў згоды на прыцягненне да крымінальнай адказнасці дэпутата, які, дарэчы, раней быў тройчы судзімы, але знайшоў шляхі, каб здабыць для сябе ажно два дэпутацкія мандаты. Ці не такую сітуацыю, якая зараз склалася, ён прадугледзеў, калі клапаціўся аб сваёй дэпутацкай недатыкальнасці?

Здаецца, менавіта, дзеля гэтага стаў народным абраннікам галоўны заатэхнік калгаса "Шлях да камунізму" Клімавіцкага раёна Грыневіч, які разам з брыгадзірам Ісачэнка ўкраў з фермы цяля. Калі злачынства выкрылася, сесія Галіцкага сельскага Савета не пажадала "здаць" праваахоўным органам свайго дэпутата.

Гэтыя свежыя прыклады сведчаць аб тым, што пералому ў барацьбе з народнымі "адмазаннікамі" своеасаблівай спекуляцыяй на дэпутацкай недатыкальнасці дабіцца будзе складана. Таму "Р" і пасля пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета не закрывае тэму, якую вядзе ўжо амаль год, а бярэ ход яе выканання пад свой кантроль.

На вялікі жаль, вельмі добрыя пастановы і рашэнні іншы раз застаюцца на паперы альбо выконваюцца толькі часткова. Калі такі лёс напаткае гэту пастанову -- дрэннымі будуць нашы справы. Усіх нас, а не толькі мясцовай улады.

Нечаканы п"р"эцэдэнт

Новы начальнік міліцыі, які бачыць сябе паліцэйскім

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі па заканадаўству Уладзімір СТАНКЕВІЧ назначаны начальнікам Маладзечанскага аддзела ўнутраных спраў. З ім гутарыць спецыяльны карэспандэнт "Р" Уладзімір АБРАМОВІЧ.

-- Уладзімір Міхайлавіч, згадзіцеся, што ваша назначэнне крыху нечакана. У вас было нямала іншых прапаноў.

-- Так, прапаноў было нямала, прытым вельмі прыватных. Напрыклад, запрашалі намеснікам міністра гандлю. Але выбраў міліцыю. Сам ніколі не пайшоў бы з міліцыі, каб не 85-ы год. Прынялі непрадуманы ўказ аб барацьбе з п'янствам, а міліцыі -- расхлёбвай кашу. Разумеў, што гэта чарговая кампанія і выступіў супраць. Памятаю, на рэспубліканскай нарадзе сказаў аб гэтым. І як пасля мяне распякаў былы начальнік упраўлення кадраў міністэрства. Хто-хто, а ён, учарашні партыец, не разумеючы нічога ў міліцыі, мог бы і памаўчаць... Не вытрымаў я і напісаў заяву...

І вось год назад старшыня Маладзечанскага гарсавета Генадзь

Дзмітрыевіч Карпенка прапанаваў узначаліць аддзел, я згадзіўся. У Вярхоўным Савеце неабходна быць аналітыкам-тэарэтыкам. Я ж -- практык.

Ходзяць чуткі, што я пайшоў з-за рознагалоссяў са старшынёй нашай камісіі Дзмітрыем Булахавым. Хацеў бы цераз "Рэспубліку" іх аправергнуць. Так, у першы час нашы адносіны былі складаныя. Аднак хутка ўсё нармалізавалася. Працаваць з Булахавым -- адно задавальненне. У яго, думаю, вялікае будучае. Асабліва шмат карыснага ён можа зрабіць у правядзенні прававой рэформы.

-- Чаму ж спынілі свой выбар на Маладзечна?

-- Блізкасць родных месц сказалася. Нарадзіўся я на Мядзельшчыне ў вёсцы Крывічы. Вельмі цягне туды, і калі б прапанавалі Вілейку ці які-небудзь іншы блізкі раён, то таксама згадзіўся б.

-- У Вярхоўным Савеце вы не аднойчы выступалі з крытыкай праваахоўных органаў. Цяпер жа самі вярнуліся ў іх...

-- Даруйце, аднак я ні разу не крытыкаваў кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў. Міліцыя -- гэта выканаўчы орган. Ёсць нармальныя законы, неабходная матэрыяльная база -- міліцыя будзе добра працаваць.

Праўда, я заўсёды выступаў за паліцыю. Што такое міліцыя? Гэта грамадскае ўзброенае фарміраванне для выканання аднаго якога-небудзь акта. Аднак многія супраць назвы паліцыі, бо асацыіруюць яе з паліцаямі. Аднак паліцаі ў гады вайны якраз і былі міліцыянерамі. Увогуле, міліцыю неабходна вызваліць ад неўласцівых для яе абавязкаў. Маю на ўвазе пажарную ахову, інспекцыю па справах непаўналетніх, пашпартную і дазвалялыную сістэмы.

Таксама міліцыя не можа справіцца і з цяперашнімі эканамічнымі злачынствамі, хоць ад яе ўвесь час патрабуюць узмацніць работу. Будзе лепшае эканамічнае становішча -- будзе менш злачынстваў. Дзе гэта было раней, каб кралі стары, разбіты ложак?! Міліцыя павінна займацца абаронай здароўя, жыцця, гонару людзей, іх уласнасці.

Сёння ў міліцыі шмат праблем. На першае месца я б паставіў матэрыяльнае і бытавое забеспячэнне. Вырашым гэтыя пытанні -- прыйдуць працаваць сапраўдныя прафесіяналы.

-- Якія крокі ўжо зрабілі ў Маладзечна?

-- Знаёмлюся з кадрамі. Работнікі тут добрыя... Выходзім у гарсавет з прапановай палепшыць фінансаванне нашага аддзела. Так, неабходна павялічыць колькасць супрацоўнікаў патрульна-паставой службы. А таксама дапамагчы палепшыць умовы працы нашых супрацоўнікаў. Да чаго дажыліся: зняволеных возім у спісанай машыне...

-- Давялося чуць, што Вярхоўны Савет "тоне" і Станкевіч, маўляў, знайшоў "цеплае месца", пакінуў камісію...

-- З маім адыходам працаздольнасць камісіі не зменшыцца. Львіную долю працы ў ёй выконвае Булахаў, і калі яго намеснікам стане не юрыст, то нічога страшнага не будзе. Аднак я не пайшоў з Вярхоўнага Савета. Усе мы выбіраліся ў грамадскі, а не пастаянны Вярхоўны Савет. Сёння ён патрабуе рэарганізацыі. Бяда, што ў ім мала прафесіяналаў. Раней прымаліся агульныя законы, і гэта было менш прыкметна. Цяпер жа пачынаюць ісці спецыфічныя. Я -- за датэрміновыя выбары. Аднак я -- супраць рэферэндуму. Нідзе вышэйшы орган улады не адпраўляецца ў адстаўку рэферэндумам. І што за лук'янаўскае пытанне збіраюцца выносіць? Дзе закон аб выбарах? Нашы палітычныя партыі -- зародкі. А менавіта ім адводзіцца галоўная роля ў выбарах па законапраекту БНФ. Такім чынам, 98 працэнтаў насельніцтва выключаецца з актыўных выбараў. І каго выбіраць? Не здзіўлюся, калі і ў нас з'явіцца свой Жырыноўскі, які выб'ецца на адной крытыцы.

Дарэчы, я не збіраюся складваць дэпутацкія абавязкі, ці адыходзіць ад дэпутацкай дзейнасці...

г.Маладзечна

БЕЛАРУС БЕЛАРУСУ -- БРАТ

Сельскагаспадарчая фірма "Амега" з Беласточчыны ахвяравала сто тысяч рублёў на аднаўленне праваслаўнай царквы ў вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна. Чаму менавіта ёй? Справа ў тым, што адзін з кіраўнікоў фірмы Валянцін Сельвясюк аднойчы па справах пабываў у Мураванцы і ўбачыў, колькі намаганняў прыкладаюць жыхары вёскі, каб аднавіць сваю святыню. Беларус Сельвясюк вырашыў дапамагчы вяскоўцам у сітуацыі, калі мясцовыя ўлады не мелі магчымасці гэта зрабіць.

Нядаўна ў гродзенскім Пакроўскім саборы адбылася перадача сродкаў. Прэзідэнт фірмы "Амега" беларус Міраслаў Цялушэцкі заўважыў, што гэтым фірма не абмяжуецца і будзе далей фінансаваць па магчымасці разнастайныя галіны культурнага і нацыянальнага адраджэння Беларусі.

Георг АСТРОЎСКІ

Адам Мальдзіс

А што ў сховішчах Расіі?

Тры папярэднія артыкулы былі прысвечаны беларускім каштоўнасцям, вывезеным пераважна ў заходнім і паўднёвым накірунках. Цяпер настаў час паразважаць пра тое, што пайшло на ўсход і поўнач, у сховішчы Расіі. Калі скрупулёзна падлічыць усё беларускае, што знаходзіцца ў музеях, бібліятэках і архівах Санкт-Пецярбурга, Масквы і іншых гарадоў усходняй суседкі, то можа аказацца, што нашага дабра там больш, чым у самой Беларусі.

ПОМНІКІ беларускай духоўнай і матэрыяльнай культуры траплялі ў Расію, найперш у яе сталіцы, пераважна ў выніку ваенных дзеянняў. Пачалі гэтую справу войскі Івана Грознага /полацкія зборы/ і Аляксея Міхайлавіча /куцеінская друкарня/, прадоўжылі ж тыя, хто падаўляў паўстанні 1795, 1830-31 і 1863-64 гадоў. Многа каштоўнасцей было эвакуіравана на ўсход на пачатку першай і другой сусветных войнаў. У Расіі засталася частка з таго, што было спачатку вывезена з Беларусі ў Германію, а потым пайшло ў агульным патоку на ўсход. Урэшце, у абедзвюх сталіцах канцэнтравалася ўсё тое, што знаходзілі на нашай зямлі шматлікія навуковыя экспедыцыі. Без згоды беларусаў, а потым без згоды ўрада рэспублікі яны забіралі з сабой рукапісы, кнігі, археалагічныя калекцыі, вырабы народных майстроў. Вядома, ёсць у зборах Расіі экспанаты з Беларусі, падараваныя, завешчаныя або прададзеныя туды іх непасрэднымі ўладальнікамі. І ставіць пытанне аб іх вяртанні ў такіх выпадках было б і нелагічна, і неэтычна. Аднак не пра такія выключэнні тут гаворка. Засяродзімся на тым, што было ўзята ваеннаю сілаю або без адпаведнага на гэта права, у парушэнне пісаных і няпісаных законаў.

На працягу ХУІІІ і XIX стагоддзяў рэквізаваныя і канфіскаваныя беларускія каштоўнасці вывозіліся пераважна ў Пецярбург. Так, у Эрмітаж і іншыя сховішчы Мікалай І загадаў перадаць творы мастацтва, кнігі і рукапісы, дастаўленыя ў сталіцу з палаца Е.Сапегі ў Гродне пасля падаўлення паўстання 1831-32 гг. У Эрмітажы таксама знаходзяцца вырабы Налібоцкай і Гродзенскай шкляных мануфактур ХУІІІ ст., флакон і кубак XII ст., выяўленыя Ф.Гурэвіч пры раскопках у Навагрудку, бронзавыя ўпрыгожанні з эмалямі, знойдзеныя на нашай тэрыторыі. Вываз гэтых знаходак адпаведным чынам не афармляўся, як і вываз беларускіх народных касцюмаў, сабраных экспедыцыямі пецярбургскага этнаграфічнага музея.

У ДЗЯРЖАЎНАЙ публічнай бібліятэцы імя М.Я.Салтыкова-Шчадрына, бібліятэцы Расійскай Акадэміі навук і універсітэцкай бібліятэцы ёсць многа кніг і рукапісаў, вывезеных з Нясвіжа /у час ваенных дзеянняў 1792-95 і 1812/ і Полацка /пасля падаўлення паўстання 1831--32 гг./. Іх лёгка выявіць па экслібрысах і ранейшых каталогах. Патрэбна таксама пошукавая работа ў зборах музея атэізму /здаецца, ужо былога/, дзе захоўваліся унікальны сонечны гадзіннік і старадаўнія абразы, якія раней належалі Полацкай акадэміі.

